Варапаеў, І. К.

# У БАРАЦЬБЕ ЗА СПРАВУ ЛЕНІНСКАЙ ПАРТЫІ

**Герой Савецкага Саюза гвардыі генерал-маёр у адстаўцы Іван Кірылавіч Варапаеў – наш зямляк. Ён прайшоў вялікі і слаўныжыццёвы шлях. Кадравы камандзір Савецкай Арміі, І. К. Варапаеў падзяліўся сваімі ўспамінамі аб пройдзенным жыццёвым шляху.**

**Камандзір Чырвонай Арміі**

Мой жыццёвы шлях вельмі падобны на жыццёвы шлях тых соцень тысяч і мільёнаў савецкіх людзей.

Бацькі былі беднякамі, у цяжкія гады царызма не маглі пазбавіцца ад прыгнёту і эксплуатацыі з боку багацеяў. З ранніх год пазнаў працу і я, яшчэ ў дзяцінстве пачаў самастойна зарабляць сабе на хлеб.

Бвло мне дванаццаць год, калі прыйшоў Вялікі Кастрычнік.

У родныя мясціны прыйшло новае жыццё. Працуючы на сельскай гаспадарцы, стаў наведваць я школу 2-й ступені – адну з першых савецкіх школ у Краснаполлі. Быў я тады – у пачатку 20-х гадоў – яшчэ падлеткам, але многае разумеў з падзей, што адбыліся тады на Краснапольшчыне, — падзей грамадзянскай вайны. Новая ўлада, новае жыццё мужалі і мацнелі ў полымі барацьбы з ворагамі працоўных.

У 1925 годзе па пуцёўцы камсамольскай арганізацыі, як актывіст быў накіраван у Гомель, на чугуна-ліцейны завод. Працоўнае сялянства давала сваё папаўненне ў рады рабочага класа. Працаваў на гэтым, потым на дрэвапрацоўчым заводзе. Тут, у дружнай і адзінай рабочай сям'і выпрацоўваўся характар, гартавалася тая сталь, што выстаяла і перамагла ў грозныя дні выпрабаванняў. Многія мае таварышы-рабочыя і тады і ў паследуючыя гады слаўна працавалі ў імя Радзімы. Заводскія камуністы далі мне рэкамендацыю ў партыю і ў памятным для мяне 1927 годзе я быў прынят кандыдатам у члены ВКП(б).

Членам партыі я стаў ужо ў арміі, у рады якой прызвала мяне Радзіма ў тым жа 1927 годзе. Служыць давялося ў артылерыйскіх часцях у роднай Беларусі. У сваёй батарэі пачаў службу чырвонаармейцам, у гэтай жа батарэі вырас я да камандзіра.

А было так. У 1929 годзе заканчваўся тэрмін маёй службы ў Чырвонай Арміі. Толькі час быў не спакойны: імперыялісты пагражалі новай вайной, наладжвалі правакацыі. Якраз у той час узнік канфлікт на КВЖД. І я дабраахвотна выказаў жаданне застацца ў радах роднай арміі, назаўсёды звязаў з ёю свій лёс.

Я стаў кадравым камандзірам Чырвонай Арміі. Вучыўся на курсах каманднага саставу, разам з усімі баявымі сябрамі – байцамі і камандзірамі працаваў над удасканаленнем баявой вывучкі. І ўрадавую ўзнагароду – ордэн Чырвонай Звязды, што я атрымаў у 1936 годзе, – успрыняў як узнагароду ўсім байцам і камандзірам нашай часці.

## За свабоду Іспаніі

Не было ў нашай краіне ў 1936–1939 гадах таго чалавека, хто б з хваляваннем не сачыў за гераічнай барацьбой іспанскага народа за сваю свабоду і незалежнасць.

У ліпені 1936 года ў Іспаніі ўспыхнуў контррэвалюцыйны мяцеж. Франкісцкія мяцежнікі, падтрымліваемыя германскімі і італьянскімі фашыстамі, пасягнулі на дэмакратысныя правы і свабоду іспанскага народа. Льецца кроў на іспанскай зямлі, палаюць гарады і вёскі, падпаленыя фашысцкімі забойцамі... З увагай і хваляваннем сачылі ўсе мы за паведамленнямі з Іспаніі.

Тады ва ўсім свеце шырыўся рух за аказанне дапамогі народу Іспаніі. Многія дабраахвотна выказалі жаданне са зброяй у руках дапамагаць іспанскаму народу. Не мог застацца ад гэтага ў баку і я.

"Просьбу старшага лейтэнанта Варапаева адпусціць яго дабраахвотнікам у Іспанію задаволіць..." Шостага мая 1937 года ў ліку дабраахвотнікаў з розных краін свету, будучых байцоў і камандзіраў інтэрнацыянальных брыгад, з борта парахода "Камсамолец" я сышоў на іспанскую зямлю.

Першыя ўражанні ад убачанага ў Іспаніі былі патрасаючымі. Яшчэ тады, у першых бітвах з фашызмам, убачыў я яго звярыны твар. Іспанія была заліта крывёй яе лепшых сыноў і дачок, крывёй безабаронных жанчын, старых і дзяцей. Руіны, папялішчы, вогнішчы... Будзьце пракляты, каты!

У баях фашысцкія ваякі былі куды менш храбрымі. Праўда, у першым баі я быў нямала здзіўлены, убачыўшы фашыстаў, якія, з вінтоўкамі наперавес, без адзінага гука моўчкі рухаліся на нашы пазіцыі. Як высветлілася, гэта была адна з "псіхічных" атак, якімі фашысты спрабавалі зламіць волю народных байцоў. Але шквальны агонь арталерыі хутка прывёў фашыстаў у пачуццё. Яны з ганьбай беглі, так і не ўздзейнічаўшы на нашу "псіхіку".

Храбрыя, хоць мала абучаныя і слаба ўзброеныя, байцы народнай арміі паказвалі ўзоры гераізма. Іспанскія камуністы былі цэментуючым ядром і натхняючай сілай байцоў свабоды. Дабраахвотнікі-інтэрбрыгадаўцы паказвалі народным байцам прыклады арганізаванасці і вытрымкі.

...Баі пад Гвадалахарай, дзе была ўшчэнт разгромлена армія італьянскіх фашыстаў, баі ў Краіне Баскаў, пад Гранадай, узяцце Таледа і Тэруэля. Ніколі не забыць гэтых дзён, ніколі не забыць слаўных

іспанскіх таварышаў! Колькі раз яны дзяліліся апошнім, колькі раз ахвяравалі жыццём дзеля сябраў. Мой шафёр Хуан Радрыга неаднаразова, рызыкуючы сабой, выратоўваў мяне ад немінучай гібелі. З выключнай цеплынёй і любоўю адносіліся іспанцы – гасцінныя, гордыя і смелыя людзі да нас, савецкіх людзей. Памятаецца такі выпадак. Пад горадам Альбасета, у Валенсіі, наша машына спынілася ля аднаго з апельсінавых гаёў. Перакладчык растлумачыў гаспадару-іспанцу, што таварыш рускі жадае купіць нямнога апельсінаў.

– Камарадо русо? – перапытаў іспанец і вочы яго загарэліся шчырай радасцю. – Салют, камарадо русо, салют Савецкі Саюз! – іспанец моцна, абодвума рукамі пацісну́ў мне руку.

Насыпаўшы вялікую меру апельсінаў, ён наадрэз адмовіўся ўзяць грошы ад "таварыша рускага"...

Памятаецца Мадрыд тых дзён, лозунгі "Но пасаран!" – "Яны не пройдуць!" – на сценах будынкаў.

У Мадрыдзе давялося мне слухаць выступленне Даларэс Ібаруры. Яе недарма называюць Пасіянарыяй-палымянай. Я слаба разумеў па-іспанску, але бачыў, што выступленне правадыра камуністаў зрабіла велізарнае ўражанне на ўсіх, хто прысутнічаў на мітынгу. Вуснамі Пасіянарыі гаварыў працоўны народ Іспаніі.

Зноў баі, зноў змаганне. Стаўшая блізкай, іспанская зямля палала ў агні. У імя яе свабоды не шкадавалі свайго жыцця сябры з-за мяжы, што прышлі на дапамогу свабодалюбіваму іспанскаму народу. І лепшай узнагародай ім была ўдзячнасць гераічнага народа Іспаніі.

З болем пакідалі дабраахвотнікі-байцы інтэрнацыянальных брыгад іспанскую зямлю.

Але яны пакідалі яе з той цвёрдай і светлай верай, якая і зараз жыве ў сэрцах усіх прагрэсіўных людзей свету: ты будзеш свабодная, цудоўная Іспанія! Падзе фашысцкі рэжым Франка і ўзыйдзе над табой сонца свабоды!

## Воіны-вызваліцелі

І вось зноў родная Беларусь. На ўспамін аб баях у Іспаніі засталася і памятная ўзнагарода – ордэн Чырвонага Сцяга. А ўперадзе былі гады службы Радзіме, вызваленчыя паходы ў Заходнюю Беларусь і Літву.

17 верасня 1939 года наша артылерыйская часць пераходзіла былую граніцу паміж Савецкай Беларуссю і яе заходнімі абласцямі, што былі гвалтоўна адторгнуты ад маці-Радзімы польскімі панамі ў гады грамадзянскай вайны. З радасцю сустракалі сваіх вызваліцеляў нашы браты з заходніх абласцей Беларусі, якія амаль два дзесятка год таміліся пад прыгнётам памешчыкаў і капіталістаў. Сардэчныя сустрэчы, братнія абдымкі і поціскі рук, мора кветак у руках сустракаючых... Кожны баец, палітрук і камандзір быў бязмерна шчаслівым ад думкі, што ён з'яўляецца воінам арміі братэрства і вызвалення народаў, воінам Чырвонай Арміі.

Калі прыгадваю маіх дарагіх таварышаў і саслужыўцаў, яшчэ і яшчэ раз хочацца сказаць цёплае слова аб іх, ушанаваць светлую памяць загінуўшых змагароў. Гэта былі класныя людзі, людзі крыштальнай чыстаты і беззапаветвай адданасці сваёй Айчыне, свайму народу, сваёй роднай партыі. Камдывізіёна Якаўлеў, камандзір батарэі Шамадзі, палітрук Красноў,камісар Маркін, малодшы камандзір Янкоў... Усе яны з гонарам служылі Радзіме, не шкадуючы свайго жыцця абаранялі яе ў грозную часіну выпрабаванняў.

**Ідзе вайна народная**

20 чэрвеня 1941 года артылерыйскі полк, якім я камандаваў, выступіў са Слуцка ў паходныя лагеры. Бязвоблачным было блакітнае чэрвеньскае неба, нішто, здавалася, не ўказвала на тое, шго хутка ўся зямля будзе ахоплена полымем вайны.

На світанні 22 чэрвеня (полк у гэты час знаходзіўся на падыходзе да Баранавіч) захад азарыўся чырвонымі водблескамі пажарышчаў, Вакол былі чутны гукі бамбёжкі – глуха рваліся бомбы. Так пачалася для байцоў і камандзіраў нашай часці Вялікая Айчынная вайна...

24 чэрвеня полк прыняў першы бой. Добра абучаныя, храбрыя артылерысты стойка змагаліся. Але адразу ж выявілася перавага ворага ў тэхніцы. Авіяцыя праціўніка абрушыла на нашы пазіцыі смертаносны шквал. Больш было ў фашыстаў тады і танкаў і артылерыі. Мы былі вымушаны адыходзіць.

Пасля цяжкіх баёў у Заходняй Беларусі наша часць адыходзіла на Міншчыну. Ішлі праз Цімкавічы, дзе зусім нядаўна пераходзілі былую граніцу, ідучы вызваляць нашых братоў і сясцёр з заходніх абласцей Беларусі. Сэрца сціскалася ад болю, ад асведамлення таго, што мы вымушаны адступаць, пакідаючы родныя гарады і сёлы.

Лета 1941 года... Яго ніколі не забыць. Стомленыя, у выцвелых ад поту і сонца гімнасцёрках байцы ішлі, не аддаючы без боя ніводнага метра роднай зямлі. Баі пад Пухавічамі, абарона Магілёва, упартае сражэнне з мотачасцямі ворага на Магілёўскай шашы.

Гераізм байцоў быў бязмежны. Людзі, выхаваныя Партыяй і Савецкай уладай – байцы і камандзіры, прадстаўнікі самых разнастайных нацыянальнасцей, прафесій, узростаў не шкадавалі свайго жыцця ў імя перамогі над ворагам. Хіба можна забыць, як у час баёў пад Магілёвам насмерць сталі нашы воіны, не адступаючы без загаду! Пасланага ў разведку байца Мірашнічэнку параніла ў абедзве нагі. Але і цяжка паранены, сцікаючы крывёю, ён не толькі выканаў заданне, але і прывёў з сабой палоннага немца. Мы адступалі, вораг часова святкаваў перамогу. Але ў нас, камуністаў, жыла непахісная вера – такі народ, як наш, перамагчы немагчыма. Наша справа правая! Мы пераможам!

...Пасля баёў пад Магілёвам – баі пад Прапойскам (Слаўгарадам), пад Крычавам. Нашу часць кінулі на абарону Чэрыкава, а мяне па

некаторы час паслалі пад Мціслаўль на барацьбу з прарваўшыміся туды танкамі Гудэрыяна.

...Нашымі войскамі пакінут Крычаў. Ідзе жнівень 1941 года. У гэты час я зноў прыбыў да сваёй часці. На той бок Сожа перапраўляліся батальёны, снараджэнне і абозы. Ля пераправы праз раку мітусіліся некалькі байцоў.

– У чым справа? – запытаў я ў малодшага камандзіра.

– Гармата патанула, таварыш кампалка. Што рабіць? Астатнія пераправіліся ўжо.

Я, зразумела, аддаў загад выцягнуць гармату і прывесці яе ў боегатоўнасць. На ўліку была кожная гармата, кожны снарад. Артылерыі адводзілася вялікая роля ў адбіцці варожага наступлення.

Артылерыйскі полк заняў разгорнутыя пазіцыі на беразе Сожа. Чэрыкаў быў узят ворагам толькі пасля надзвычай упартых баёў. А спроба фашыстаў фарсіраваць Сож з ходу скончылася поўнай для іх няўдачай. На Сажы варожае наступленне было затрымана надоўга.

Але сілы ворага яшчэ намнога пераўзыходзілі нашы сілы. Нашы часці вымушаны былі адыходзіць на Краснаполле.

...Вось ён, так добра знаёмы шлях Чэрыкаў–Краснаполле. Вось яны, дарагія сэрцу родныя мясціны. З імі зноў давялося сустрэцца ў грозную часіну.

Полк заняў абарону ў раёне Пільні. Першы націск немцаў быў адбіт. Быў адбіт і другі, трэці націскі.. .Немцы спрабавалі ахапіць нас з флангаў. Часць атрымала загад адыходзіць.

Краснаполле мы праходзілі вечарам. Нягледзячы на жнівень (было гэта паміж 11 і 18 жніўня 1941 года, здаецца чысла 14), дзень выдаўся пахмурным, невясёлым. Сярод байцоў было нямала краснапальчан. З ныючым болем у сэрцах пакідалі яны родныя мясціны.

Жыхары з сумам глядзелі ўслед уходзячым чырвонаармейцам.

– Мы вернемся, таварышы! – усхвалявана крыкнуў хтосьці з камандзіраў. – Мы абавязкова вернемся!

Гэтыя словы прагучэлі як клятва...

Часць заняла абарону на Мхінічах. Я яшчэ паспеў ненадоўга заехаць ў Трубільню дзе жыла маці. Яна сустрэла мяне з хваляваннем, з вялікая трывогай.

...Авангарды трымалі Халмы. Гарматы і байцы былі замаскіраваны. Дазорныя пільна сачылі за прасоўваннем ворага.

Але вось на апусцелай вясковай вуліцы застракатаў матацыкл. Нейкі абнаглелы фашыст, пасланы ў разведку, страціў пачуццё небяспекі.

– Узяць жывым! – загадаў я. – Падпусціць бліжэй і...

Разлік лёгкай гарматы зрабіў удалы стрэл. Снарад разарваўся так, што немца амаль не пашкодзіла. Хутка, абалдзела моргаючы вейкамі, ён стаяў перад намі. Фашысты быліі тады яшчэ наглыя, ап'янелыя ад часовых поспехаў. Тым не менш немец даваў падрабязныя адказы на ўсе пытанні.

У Мхінічах мы прынялі бой. Фашысты панеслі вялікія страты, так і не здзейсніўшы свайго намеру апракінуць нас з ходу. Нашы байцы біліся па-геройску.

Апошні бой на зямлі Краснапольшчыны мы далі ў Выдранцы. Ён цягнуўся чатыры гадзіны. Яшчэ чатыры гадзіны смяротнай схваткі з нянавісным ворагам. Свой доўг перад Радзімай, перад роднымі мясцінамі мы выканалі да канца.

З баямі адыходзілі на Браншчыну, потым – на Украіну. Уперадзе былі жорсткія баі на украінскай зямлі, пад Курскам, Варонежам, ля сцен легендарнага Сталінграда. У бітвах кавалася перамога, якая была здабыта агульнымі намаганнямі ўсяго нашага гераічнага народа, нашай слаунай Чырвонай Арміі.

Іх не зламілі выпрабаванні. Яны выстаялі ў дні абароны, І ў памятным 1943 годзе наша гераічная армія пачала сваё пераможнае наступленне. Сталінградскі стэп, Дон, Днепр, Адэса, Сарны... Усё ўперад і ўперад ідзем на Захад!

Сапраўдным святам для мяне была вестка аб тым, што гераічная наша армія вызваліла родную Краснапольшчыну ад фашысцкіх захопнікаў.

### Перамога

Мы ішлі ўперад, вызваляючы Радзіму. Ідзем уперад... Неперадавальна хвалюючае слова "уперад"!

У час баёў за вызваленне Украіны я камандаваў артылерыяй дывізіі, а потым і корпуса. Артылерысты з гонарам слўжылі Радзіме, не шкадавалі і самаго жыцця ў імя вызвалення роднай зямлі.

Вызвалена Савецкая Украіна. Праследуючы адступаючага ворага, нашы воіны перайшлі дзяржаўную граніцу, нясучы на сваіх штыках вызваленне стогнучым пад фашысцкім ярмом народам Еўропы.

З жніўня 1944 года ў раёне горада Магнушаў (Польшча) нашы часці фарсіравалі шырокую Віслу і на яе заходнім беразе ўтварылі плацдарм. Гэта з'яўлялася часткай шырока задуманай аперацыі.

– Плацдарм трымаць у што б там ні стала. Ні кроку назад! – загадаў камандуючы арміяй Васілій Іванавіч Чуйкоў, – "Богу вайны", – сказаў пры сустрэчы камандарм, – забяспечыць утрыманне плацдарма.

Невялікі – 12 кіламетраў па фронту і 8 кіламетраў глыбінёй – плацдарм меў важнае стратэгічнае значэнне. Ён навісаў над варожым флангам, пагражаў тылам ворага, з'яўляўся пастаяннай пагрозай – адсюдь у любы момант магло быць начата наступленне.

Гітлераўцы прыходзілі ў дзікую лютасць ад існавання плацдарма. Фашысцкае камандаванне загадала любой цаной ліквідаваць яго і скінуць нашы часці ў Віслу. На невялікі плацдарм абрушыліся масіраваныя ўдары авіяцыі і артылерыі ворага.

Атакі, атакі, бясконцыя бамбёжкі, абстрэлы і зноў атакі. На плацдарме не было ніводнага жывога кавалка зямлі, ён нагадваў сабой

параненага, зрашэчанага кулямі воіна. Атакі ворага нарасталі. Парой станавілася зусім цяжка. І тады кожны баец паўтараў словы, якія чуў я ў рэспубліканскай Іспаніі, пад сценамі Мадрыда, там, дзе коціць свае празрыстыя воды Гвадалахара: "Но пасаран! " – "Яны не пройдуць!" І яны не прайшлі.

Нібы аб граніт разбіліся аб стойкасць і мужнасць нашых байцоў усе атакі фашыстаў. Нашы воіны біліся па-сталінградску, па-гвардзейску.

Плацдарм праіснаваў да 16 студзеня 1945 года – да таго дня, калі наша армія пачала рашучае наступлепе ў Польшчы.

Многія байцы і камандзіры былі ўзнагароджаны, прадстаўлены да звання Героя Савецкага Саюза. Званне Героя Савецкага Саюза было прысвоена і мне. Я ўспрыняў гэтую ўзнагароду народа як узнагароду ўсім мужным воінам нашай часці. У тым жа 1944 годзе Урад прысвоіў мне званне генерал-маёра.

У штабе чацвёртага гвардзейскага корпуса адбылася хвалюючая сустрэча з земляком і сябрам генералам Афанасіем Шамянковым. Мы моцна абняліся, успомнілі былыя паходы і баявых сяброў.

Вялікую Айчынную вайну я закончыў на Одэры, дзе былі разгромлены буйныя сілы фашыстаў. Тое, аб чым марылі савецкія людзі ў цяжкія дні выпрабаванняў, здзейсніліся! Наш народ выстаяў у нялёгкай барацьбе, перамог ворага і на штыках сваіх байцоў прынёс вызваленне іншым народам.

Слава вам, наш народ, наша гераічная армія!

## Радавы вялікай партыі

Самай дзіўнай рэччу для мяне калісьці з‘яўляліся... дзесяцічныя дробі. Так, так, дзесяцічныя дробі, якія вывучаюць у школе. І калі б мне сказалі, што я буду ведаць такую "мудроную" рэч, я, напэўна вельмі б здзіўся. І ўжо зусім бы смяяўся, калі б мне, звычайнаму сялянскаму хлопцу з бядняцкай сям‘і сказалі, што я змагу стаць генералам.

...Савецкага генерала з простага сялянскага хлопца выхавалі Камуністычная партыя, Савецкая ўлада. Гэта яны мільёнам людзей з народа адкрылі ўсе шляхі, узнялі іх да творчасці, загартавалі для барацьбы. І няма большага шчасця як служыць свайму народу, сваёй Радзіме. І самы вялікі гонар – быць камуністам, радавым вялікай Ленінскай партыі.

Будуючы новае жыццё, абараняючы свяшчэнную зямлю Айчыны, яе свабоду і шчасце, мірную працу савецкіх людзей, змагаючыся за вызваленне народаў, змагаліся мы за вялікую справу Ленінскай партыі, партыі камуністаў. Пад яе кіраўніцтвам савецкія людзі дабіліся велізарных поспехаў, будуюць зараз лепшае ў свеце грамадства – камунізм.

Найвялікшы гонар і шчасце –змагацца за влікую справу Ленінскай партыі, за камунізм!

Справе партыі, народу, Радзіме – усе нашы сілы, энергію, усё наша жыццё.

**Варапаеў, І. К. У барацьбе за справу Ленінскай партыі / І. К. Варапаеў ; запісаў Б. Фірштэйн // Чырвоны Сцяг (Краснаполле). — 1959. — 17, 28, 31 кастрычніка. — С. 4.**